Выхоўваць актыўных барацьбітоў за камунізм!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 35 (544) Субота, 30 лістапада 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVII-ы

ПАЗАЎЧОРА ў актавай зале галоўнага корпуса адбыўся агульнаўніверсітэцкі партыйны сход. Са справаздачным дакладам выступіла сакратар партыйнага камітэта БДУ Т. Я. **Дударава.**

— Справаздачна-выбарчы сход,— заявіла Т. Я. Дударава,— праходзіць у знамянальныя дні актыўнай падрыхтоўкі партыі, усяго савецкага народа да снежаньскага Пленума ЦК КПСС, у абставінах усенароднай барацьбы за ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXII з'езда КПСС.

Камітэт, партыйная арганізацыя і ўвесь калектыў універсітэта ў справаздачным перыядзе накіроўвалі ўсе свае намаганні на выкананне Закона аб умацаванні сувязі школы з жыццём, на далейшае ўдасканаленне вучэбнага працэсу. Кіруючымі дакументамі ў гэтым былі Праграма партыі, рашэнні Пленумаў ЦК КПСС.

Падрабязна спыніўшыся на арганізацыйнай рабоце партыйнага камітэта, дакладчыца адзначыла, што за справаздачны перыяд узмацнілася авангардная роля камуністаў у акадэмічных групах. Гэта адбілася і на вучобе, і на дысцыпліне студэнтаў.

Партком на сваіх пасяджэннях і на сходах абмяркоўваў найбольш актуальныя пытанні з жыцця універсітэта. За выкананнем прынятых рашэнняў быў установлены належны кантроль. З гэтай мэтай заслухоўваліся справаздачы адказных за выкананне таго ці іншага даручэння. Было арганізавана дзяжурства членаў кам.тэта. Яны прынімалі наведвальнікаў, разглядалі скаргі і, як правіла, у аператыўным парадку вырашалі бягучыя справы.

Аднак партыйны камітэт мала займаўся справамі на вячэрнім і завочным аддзяленнях. Атрымалася так, што ні на пасяджэннях камітэта, ні на сходах ні адно сур'ёзнае пытанне не было ўзнята, звязанае з арганізацыяй вячэрняга і завочнага навучання, хаця ў рабоце гэтых аддзяленняў ёсць нямат цяжкасцей і недахопаў.

Не заўсёды надавалася належнае значэнне ролі партыйных даручэнняў. Менавіта гэтым у першую чаргу трэба растлумачыць слабую настаноўку індывідуальнай работы камуністаў сярод студэнтаў. У нас яшчэ нямат задолжнікаў, многае трэба зрабіць для ўмацавання дысцыпліны. Колькасць жа пропускаў студэнтамі заняткаў без уважлівых прычын не толькі не паменшылася, але і павялічылася (22.695 гадзін за мінулы навучальны год). Гэта асабліва характэрна для фізічнага і філалагічнага факультэтаў.

Новаму саставу партыйнага камітэта, партыйным бюро факультэтаў трэба больш увагі ўдзяліць арганізацыйнай рабоце, дамагацца, каб кожны камуніст выконваў свой партыйны абавязак. Толькі ў гэтым выпадку мы зможам забяспечыць пастаянны ўплыў на ўсю студэнцкую масу.

Нельга забываць, што неабходна лепей выхоўваць і саміх выхавацеляў. На жаль, выпадкі парушэння партыйнай дысцыпліны асобнымі камуністамі не адзіныя. І з парушэннямі трэба весці рашучую барацьбу.

Зараз разгарнула сваю работу група садзеяння партыйна-дзяржаўнаму кантролю. Першыя яе крокі радуюць, але ёй прадстаіць яшчэ многае зрабіць, каб стаць надзейнай памочніцай партыйнага камітэта і рэктарата ў рашэнні ўзросшых задач, якія паставіў перад вышэйшай школай чэрвеньскі Пленум ЦК КПСС. Галоўная з іх — падрыхтоўка высококваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукі, культуры, фарміраванне ў іх марксісцка-ленінскага светапогляду і камуністычнай свядомасці.

Партком, рэктарат у сваёй практычнай рабоце стараліся шмат увагі ўдзяляць паляпшэнню зместу ўсяго вучэбнага працэсу. Павысілася кваліфікацыя прафесарска-выкладчыцкага саставу, удасканальваліся вучэбныя планы і праграмы. Вялікая ўвага ва універсітэце ўдзялялася ліквідаванню дубліравання матэрыяла, павышэнню якасці практычных і семінарскіх заняткаў.

У мэтах павышэння ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню лекцый на кафедрах гісторыі КПСС (загадчык кафедры В. М. Сікорскі), гісторыі філасофіі і логікі (І. М. Лушчыцкі) і іншых сістэматычна абмяркоўваюцца тэксты лекцый, вынікі семінарскіх заняткаў, выкарыстанне выкладчыкамі наглядных дапаможнікаў і г. д. Каштоўным з'яўляецца вопыт абмеркавання на кафедрах аглядаў навейшай літаратуры і дасягненняў практыкі па асобных праблемах і дысцыплінах. Поўнасцю апраўдала сябе практыка стварэння на факультэтах і курсах вучэбных камісій. Яны ўмела ажыццяўляюць кантроль за паспяховасцю, наведваннем заняткаў, арганізацыяй работы студэнтаў на вытворчасці.

Гэтыя і іншыя меры далі добрыя вынікі. 42 працэнты студэнтаў летнюю экзаменацыйную сесію здалі на «выдатна» і «добра», на больш высокім узроўні прайшлі дзяржаўныя экзамены. І ўсё ж у арганізацыі вучэбнага працэсу больш за ўсё недахопаў. 180 студэнтаў у летнюю сесію атрымалі нездавальняючыя адзнакі. На радзе курсаў адсутнічае суровае асуджэнне абібокаў, парушальнікаў дысцыпліны і норм маралі. Вялікую пасіўнасць у гэтай справе праяўляюць прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі.

Нядаўна камісія ЦК КПБ праверыла арганізацыю вучэбна-выхаваўчай работы на юрыдычным факультэце. Ускрыты сур'ёзныя недахопы. Устаноўлена, што партыйная арганізацыя факультэта часта стаіць у баку ад рашэння задач, звязаных з падрыхтоўкай высококваліфікаваных спецыялістаў. Гэты папрок можа зрабіць і іншым факультэцкім партыйным арганізацыям. Вось чаму ўноў выбранаму парткому, партарганізацыям трэба больш глыбока і канкрэтна ўнікаць у арганізацыю вучэбнага працэсу, часцей абмяркоўваць гэтыя пытанні на сходах, пасяджэннях камітэтаў, бюро, у партгрупах. І, канешне, трэба своечасова ўскрываць, папярэджваць недахопы і памылкі, хутка ліквідоўваць іх.

Гаворачы аб навукова-даследчай рабоце, дакладчыца адзначыла, што наш універсітэт становіцца адным з вядучых даследчых цэнтраў па некаторых важнейшых праблемах сучаснай навукі. Цяпер тут распрацоўваюцца 48 навуковых праблем па 330 тэмах. Але не толькі вядучыя вучоныя, але і маладыя навуковыя работнікі ўдзельнічаюць у міжнародных і ўсесаюзных навуковых з'ездах, канферэнцыях і семінарах. У 1962 годзе навуковыя работнікі універсітэта апублікавалі 24 манаграфіі, 20 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, 309 навуковых артыкулаў. Дакладчыца прыводзіць шматлікія прыклады дапамогі БДУ прадпрыемствам краіны ва ўдасканальванні вытворчых працэсаў.

Задача састаіць у тым, каб павялічыць колькасць і павысіць якасць навуковых даследаванняў, умацоўваць садружнасць навукі і вытворчасці. А для гэтага неабходна ствараць патрэбныя ўмовы для работы дысертантаў, палепшыць кіраўніцтва аспірантамі. Больш увагі партыйны камітэт павінен удзяляць навуковаму студэнцкаму таварыству. Дакладчыца прапануе стварыць на ўсіх факультэтах і пры асобных кафедрах групы па вывучэнню замежных моваў. Навуковы работнік, выкладчык універсітэта павінен ведаць мінімум адну з замежных моваў — вось як цяпер ставіцца пытанне.

Шмат месца ў дакладзе было адведзена палітыка-выхаваўчай рабоце. Т. Я. Дударава падрабязна прааналізавала дзейнасць сеткі партыйнай асветы, падрабязна спынілася на значэнні новых масавых форм прапаганды і агітацыі. Зроблена шмат па выкананню рашэнняў чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС, у прыватнасці, важны крок уперад за справаздачны перыяд зроблена у справе працоўнага выхавання студэнцтва.

Заслугоўвае распаўсюджвання вопыт работы ў групах кураторау В. А. Мельцара (гістарычны факультэт), Н. В. Галаўко (філалагічны факультэт) і інш. У іх асобе студэнты бачаць аўтарытэтных і патрабавальных кіраўнікоў, чулых таварышаў. Ёсць у нас нямала выкладчыкаў, якія вядуць вялікую выхаваўчую работу ў акадэмічных групах, у інтэрнатах, трымаюць моцную сувязь са студэнтамі.

І ўсё ж размах, узровень і адказнасць палітыка-выхаваўчай работы не адказваюць сучасным патрабаванням. Мы павінны ўзняць ролю індывідуальных форм і метадаў выхавання, зрабіць прапаганду і агітацыю больш яркай і дзейснай. Нельга мірыцца з тым, што намецілася нейкае адставанне ў арганізацыі мастацкай самадзейнасці. Ёсць істотныя недахопы і ў арганізацыі спартыўна-масавай работы.

— Нашы сілы і сродкі, — гаворыць сакратар партыйнага камітэта, — дазваляюць партыйнай арганізацыі выхоўваць усебакова развітых спецыялістаў, ідэйна вытрыманых і фізічна загартаваных людзей. Менавіта не адна баковая падрыхтоўка студэнтаў на лекцыях і семінарах, а гарманічнае развіццё асобы павінна стаяць у цэнтры ўвагі нашых выкладчыкаў і актывістаў.

Днямі прайшоўшыя прафсаюзная і камсамольская канферэнцыі паказалі, што партыйнаму камітэту, партыйным арганізацыям факультэтаў трэба палепшыць кіраўніцтва і ўзмацніць кантроль за дзейнасцю прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый.

Заканчваючы даклад, тав. Т. Я. Дударава ад імя ўсіх прысутных на сходзе выказала ўпэўненасць, што камуністы Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна не пашкадуюць сваіх сіл для паспяховага выканання гістарычных рашэнняў XXII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

* * *

Першым у спрэчках па дакладу выступае член партыйнага бюро біялагічнага факультэта **А. І. Ляўко.** Ён гаворыць, што толькі мэтанакіраваная сумесная работа партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай арганізацый, кафедр і і дэканата можа даць добрыя вынікі ў выхаванні студэнтаў. У аб'яднанні такіх намаганняў партбюро біялагічнага факультэта бачыць цяпер сваю важнейшую задачу.

Прамоўца адзначае дзейнасць тэматычных камсамольскіх сходаў, якія развіваюць ініцыятыву моладзі, абуджаюць думку, узнімаюць адказнасць кожнага за гонар і поспехі калектыву. Такія сходы становяцца традыцыйнымі на факультэце.

Цікавасць выклікаў расказ тав. Ляўко аб практыцы падрыхтоўкі характарыстык на кожнага студэнта. Яны пішуцца на ўсіх курсах і шырока абмяркоўваюцца. Прынцыповая крытыка, аб'ектыўная ацэнка студэнтамі адзін аднаго прыносяць добрыя вынікі. Гэтую практыку павінны пераняць і іншыя факультэты.

Сакратар камітэта камсамола універсітэта **Г. Я. Рылюк** прысвяціў сваё выступленне ролі камсамольскай арганізацыі ў падрыхтоўцы ідэйна загартаваных, высококваліфікаваных спецыялістаў. Ні камітэт камсамола, ні партком яшчэ глыбока не прааналізавалі прычыны непаспяховасці многіх першакурснікаў. Таму і рашэнне гэтага важнага пытання пакуль не ідзе далей агульных размоў і заклікаў.

Вельмі важна адзначыць, гаворыць тав. Рылюк, што і пяцікурснікі выпадаюць з-пад нашага ўплыву. Адсюль не-выпадковыя правалы на дзяржэкзаменах. Камсамольскі важак просіць партком аказваць дапамогу камсамольскім актывістам, узмацніць кантроль за дзейнасцю грамадскіх арганізацый, куратараў.

Дацэнт юрыдычнага факультэта **Я. А. Матвіенка** далажыў сходу аб тым, як выконваюцца рэкамендацыі камісіі ЦК КПБ, праверыўшай работу партарганізацыі факультэта. Але некаторыя задачы, адзначае ён, мы не можам самі вырашыць. У першую чаргу гаворка ідзе аб паляпшэнні вучэбнага працэсу. Нам патрэбны матэрыялы і навейшае абсталяванне для засваення студэнтамі асноў крыміналістыкі, іншых дысцыплін.

— Пасля чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС, — гаворыць член партыйнага бюро гістфака студэнт **В. Т. Радзецкі,** — у нас значна ажывілася палітыка-выхаваўчая работа, больш рознабаковай сталі яе формы і метады. Партбюро ажыццяўляе шэраг цікавых мерапрыемстваў па ўзмацненню авангардnай ролі камуністаў у групах. Днямі гэтае пытанне абмяркоўвалася на пасяджэнні бюро, на якім ішла сур'ёзная размова аб павышэнні ролі гласнасці ў ідэалагічнай рабоце.

Тав. Радзецкі адзначае, што партком не заўсёды прыслухоўваецца да голасу калектыву і часам робіць памылкі. Ён лічыць няправільным рашэнне аб тым, каб кожны факультэт выдаваў у гурткі агульнаўніверсітэцкай мастацкай самадзейнасці мінімум 10 працэнтаў факультэцкіх гурткоўнаў. Гэта — прымушэнне да дзей-

(Заканчэнне на 2 стар.)

Курс—на зімовую сесію

Новыя спецыяльнасці фізічнага факультэта

Пабудова матэрыяльнай базы камуністычнага грамадства ў сучасных умовах немагчыма без шырокага ўкаранення ў прамысловасць сродкаў аўтаматыкі, тэлемеханікі, радыё. Развіццё апошніх залежыць ад наяўнасці высококваліфікаваных спецыялістаў у галіне радыёэлектронікі. Менавіта такіх спецыялістаў рыхтуе цяпер фізічны факультэт на новым аддзяленні радыёэлектронікі, на якім ужо цяпер навучаецца частка студэнтаў на ўсіх пяці курсах.

Якую ж спецыяльнасць набудуць будучыя выпускнікі радыёфізічнага аддзялення? Гэта будучыя супрацоўнікі навукова-даследчых лабараторый, канструктарскіх бюро і заводскіх лабараторый па такіх цяпер неабходных спецыяльнасцях, як электронныя лічыльныя машыны, аптычныя квантавыя генератары, спецыялісты ў галіне электрафізікі, паўправадніковаў і газавай электронікі, радыёфізікі звышвысокіх частот і інш. Іншымі словамі — гэта актыўныя будаўнікі м'ірнай эканомікі нашай краіны. Навучанне студэнтаў па гэтых спецыяльнасцях у цяперашні час вядуць чатыры кафедры факультэта.

Падрыхтоўка спецыялістаў па радыёфізіцы і электроніцы праводзіцца пакуль на старых лабараторных плошчах і на маючымся на кафедры абсталяванні.

Стварэнне новых спецыяльных лабараторый радыёфізічнага профілю патрабуе новых плошчаў і новых выдаткаванняў на абсталяванне. З гэтай мэтай запланавана і ўжо ў бліжэйшы час пачнецца будаўніцтва новага лабараторнага корпуса радыёэлектронікі. З увядзеннем гэтага корпуса ў эксплуатацыю прамысловыя прадпрыемствы і навукова-даследчыя інстытуты рэспублікі поўнасцю будуць забяспечаны высококваліфікаванымі спецыялістамі па радыёэлектроніцы.

Студэнты аддзялення радыёфізікі, нягледзячы на ўказаныя цяжкасці, упарта авалодваюць новай спецыяльнасцю і вельмі сур'ёзна рыхтуюцца да зімовай экзаменацыйнай сесіі.

Дацэнт А. ЛАБУДА,
нам. дэкана фізфака.

КАНТРОЛЬ У ДЗЕЯННІ

Нядбайнасць каштуе 150 рублёў

Кожны, на любым месцы павінен добрасумленна выконваць свае службовыя абавязкі. Гэта ўсім вядомая ісціна. Але аб ёй чамусьці забылі слесар-водаправодчык І. Г. Газман, электраманцёр І. Д. Чаркас і інжынер па энергетыцы А. В. Аношка.

Адбылося так, што інжынер сур'ёзна не праінструктаваў прынятага на работу І. Д. Чаркаса, а дзяжурны слесар І. Г. Газман самым безадказным чынам аднёсся да сваіх абавязкаў. Ён пайшоў з работы, не папярэдзіўшы тав. Чаркаса, які ўпершыню дзяжурыў у галоўным корпусе, што рухавік, які сілкуе насосы, уключаецца аўтаматычна.

І. Д. Чаркас убачыў, што рухавік не працуе, рашыў яго завесці, але заклініў адначасова магнітны пускальнік. Аўтаматычнае прыстасаванне не магло дзейнічаць, і рухавік працаваў бесперапынна больш пяці гадзін. У выніку бак пераноўніўся вадой, і яна пайшла цераз край, пашкодзіўшы ў рознай ступені 19 пакояў на пяці паверхах вучэбнага будынку.

Універсітэт панёс страты ў размеры 150 рублёў. Вось да чаго прывяла нядбайнасць. Група садзеяння партыйна-дзяржаўнаму кантролю, разглядзеўшы гэтае пытанне, прызнала неабходным зрабіць грашовы налік на вінаватых. Адначасова група прапанавала кіраўнікам адміністратыўна-гаспадарчай часткі ўзмацніць кантроль за работай абслугоўваючага персанала.

А. ГАЛАЎКО.

Выхоўваць актыўных барацьбітоў за камунізм!

(Пачатак на 1 стар.)

насці, і яно не дасць станоўчых вынікаў. Трэба ўзмацніць кантроль парткома за шэфскай работай факультэтаў. Гісторыкі дагэтуль не змаглі, напрыклад, даведацца, над кім яны шэфствуюць.

Крытычным было выступленне сакратара партбюро філфака **А. А. Волка**. Ён адзначыў, што ў дзейнасці парткома было шмат дэкларатыўнасці, адчувалася нязнанне людзей. Асабліва нецярпімая недаацэнка ролі арганізатарскай работы. Патрэбна жывая справа, а не агульныя заклікі. Гэта датычыцца і да многіх выкладчыкаў, якія часам ператвараюцца з выхавацеляў у рэгістратараў падзей у студэнцкіх калектывах.

Прамоўца крытыкуе камуніста А. В. Кірсанава за тое, што ён няўважлівы да дробязей быту студэнтаў. Справа даходзіць да таго, што студэнтам прыходзіцца месяцамі выпрошваць у гаспадарчых работнікаў рэпрадуктар ці пару урнаў для інтэрната.

— Сёлета ва універсітэце, як і ў іншых вну, — гаворыць дацэнт кафедры гісторыі КПСС **М. Р. Круцько**, — пачалося жыццё новага курса — асноў навуковага камунізма. Гэта патрэбная дысцыпліна. Аднак у чытанні курса сустракаюцца пэўная цяжкасці, угледзець якія выкладчыкам павінны дапамагчы партком, дэканаты.

Тав. Круцько звяртаецца да рэктарата за дапамогай у рашэнні пытанняў, што звязаны з публікацыяй навуковых работ.

Прафесар **Н. Е. Рагозін** гаварыў аб неабходнасці глыбей аналізаваць пралікі ў выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў, аб тым, што выкладчыкам ні ў якім разе нельга станавіцца на шлях адміністравання пры рашэнні пытанняў вучобы і выхавання.

Са словам удзячнасці звярнуўся на сходзе студэнт 2 курса аддзялення журналістыкі **В. У. Слушнік** да куратараў Л. А. Шаўчэнка, П. П. Шуба і іншых. Разам з тым ён крытыкуе выкладчыка А. І. Гётуха за недавер'е да студэнтаў, нявер'е ў іх сілы. Тав. Слушнік просіць партком удзяляць быту студэнтаў больш увагі.

— Нам трэба лепей выкарыстоўваць унікальнае абсталяванне ў лабараторыях, — з такім заклікам звярнуўся сакратар партбюро хімфака **В. Ф. Цікавы**. Не менш важна рэктарату звярнуць увагу на абсталяванне вучэбнага працэсу. Нельга лічыць нармальным, калі мы маем устаноўкі для правядзення складаных і вельмі дакладных эксперыментаў, а разам з тым не хапае элементарнага — штатываў, колб, звычайных вагаў. Гэта датычыцца ў цэлым да ўсяго факультэта. Трэба звярнуць увагу на стварэнне добрых умоў для работы новай кафедры палімераў.

Усе прысутныя падтрымалі гэтую зусім абгрунтаваную просьбу. Падтрыман быў і вопыт замацавання курсаў за кафедрамі, аб якім расказаў тав. Цікавы. Менавіта такім шляхам, як паказала практыка, можна ўстанавіць цесныя сувязі кафедр са студэнтамі, уцягнуць у выхаваўчую работу ўсіх без выключэння выкладчыкаў і аспірантаў.

У гэтых адносінах заслугоўвае таксама ўвагі вопыт правядзення сумесных пасяджэнняў партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных органаў факультэта з работнікамі кафедр. Аб ім гаварыў в. а. дэкана геафака **Д. М. Карулін**.

Выступіўшыя ў спрэчках па дакладу рэктар універсітэта **А. Н. Сеўчанка** і іншыя прамоўцы падрабязна гаварылі аб шляхах далейшага развіцця універсітэта, аб будоўлях і іншых праблемах.

У рабоце схода ўдзельнічалі намеснік загадчыка аддзела ЦК КПБ **Я. М. Бабосаў**, міністр вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР **М. В. Дарашэвіч**, намеснік загадчыка аддзела Мінскага прамысловага абкома партыі **Н. С. Лушчакоў**, сакратар Ленінскага райкома партыі **Т. І. Асіненка**. М. В. Дарашэвіч і Т. І. Асіненка выступілі на сходзе з прамовамі і пажадалі ўсяму калектыву універсітэта новых поспехаў у рабоце.

На сходзе было прынята разгорнутае рашэнне, накіраванае на ўзняцце ролі партыйнай арганізацыі БДУ ў падрыхтоўцы высококваліфікаваных спецыялістаў.

Выбран новы састаў партыйнага камітэта. Сакратаром парткома выбран старшы выкладчык кафедры палітычнай эканоміі **Андрэй Яфімавіч Бураўскі**.

Клічуць турысцкія дарогі

З 1961 года секцыя турызма альпінізма праводзіць масавыя зімовыя паходы на лыжах па Беларусі і іншых раёнах краіны, у якіх ужо ўдзельнічалі сотні студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта. Штогод удзельнікі паходаў праводзяць дзесяткі гутарак з мясцовым насельніцтвам, са школьнікамі, расказваюць ім аб універсітэце, аб падзеях у краіне і за мяжой.

27 лістапада быў праведзены другі «турысцкі агеньчык», на якім сабраўшыся пачулі і убачылі паходы нашых турыстаў на Кольскі паўвостраў і Памір. Убачылі — таму, што ўдзельнікі паходаў знялі фільмы, пакуль што адзіныя ад універсітэце, а памірскі фільм — нават каляровы. Секцыя жыве цяпер паўнакроўным жыццём: выпускае стэнды, праводзіць трэніроўкі, развучвае песні, будуе і рыхтуе да ажыццяўлення планы паходаў, сустрэч.

Сёлета ў секцыю прыходзіць вялікая колькасць навічкоў. Пачынаючы з «адзінак» (паходаў I катэгорыі цяжкасці), турыст рыхтуе сябе да паходаў больш складаных, аж да 5 катэгорыі цяжкасці. Удзельнікі зімовых паходаў (увесь васьмідзённы паход у любы куток Беларусі каштуе 10—12 рублёў, бо дарогу аплочвае універсітэт) ужо сёлета ўлетку змогуць пабываць на Каўказе, у Карпатах, Прыбалтыцы і іншых месцах, змогуць пазнаміцца з цудоўнай прыродай, гістарычнымі мясцінамі і г. д. Дагэтуль у секцыі ў асноўным займаюцца фізікі, матэматыкі і хімікі. Здзіўляюча, але ў ёй няма гісторыкаў і географаў, студэнтаў, ужо самой спецыяльнасцю прызваных вандраваць. Секцыя чакае сустрэч у радах турыстаў таксама і філолагаў, юрыстаў, біёлагаў. Запіс жадаючых удзельнічаць у зімовых паходах вядзецца ў клубе турыстаў (530 пакой, каля спортзалы) па панядзелках, серадах, пятніцах да 15 снежня з 19 да 21 гадзіны. Прыходзьце, вы не пашкадуеце!

Барыс ЯШЧЫН,
старшыня секцыі турызма-альпінізма БДУ.

Шлях у навуку

Ужо каля двух месяцаў ідуць заняткі ў новага набора аспірантаў універсітэта. Сёлета, у параўнанні з папярэднімі гадамі, некалькі змяніўся парадак прыёму ў аспірантуру. Па рэкамендацыі кафедры найбольш здольныя студэнты, якія праявілі сябе ў навуковай працы, дапускаюцца да ўступных экзаменаў адразу пасля заканчэння вну. Пра трох з іх, цяперашніх аспірантаў-першакурснікаў, расказваецца ў гэтым артыкуле.

Тры чалавекі. Тры розныя лёсы. Розныя?.. Леаніда Акаловіча добра ведаюць на філалагічным факультэце. Нязменны старшыня студэнцкага навуковага таварыства, член камсамольскага бюро факультэта, ён шмат працы і старанняў аддаў наладжванню студэнцкай навуковай работы.

Што можа быць радней за матчыну мову? Менавіта любоў да роднага слова кіравала Леанідам, калі ён на працягу пяці гадоў у час летніх канікулаў старанна запісваў і апрацоўваў народныя гаворкі ў розных месцах Міншчыны.

А ўласная навуковая праца!.. Даклады невысокага светлавалосага юнака слухалі гурткоўцы не толькі нашага універсітэта, але і універсітэтаў Львова, Адэсы, Ужгарада, яны былі аднесены да першай катэгорыі на рэспубліканскім аглядзе студэнцкіх навуковых работ...

Цяжка ўстанавіць, калі ў Пеці Рогача зарадзілася любоў да геаграфіі. Магчыма, тады, калі ён, яшчэ басаногім хлапчуком, вымяраў сцежкі навакольных лясоў, глыбіню шматлікіх рэчак адной з прыгажэйшых мясцін Мядзельшчыны. Ці, можа, тады, калі ён услед за ўказкай настаўніка вандраваў у думках па гарах Каўказа і Карпат, па стэпах Украіны і Казахстана... Але як бы там ні было, пасля двух гадоў працы на сланцавых шахтах Эстоніі Пётр, не здрадзіўшы дзіцячай мары, паступіў у наш універсітэт на геаграфічны факультэт. Пяць гадоў вучобы, любімая праца ў гуртку эканамічнай геаграфіі, шматлікія турысцкія паездкі ў розныя куткі Савецкага Саюза. Круглы выдатнік, ленінскі стыпендыят, член камсамольскага бюро факультэта, Пеця Рогач усюды і заўсёды быў прыкладам для іншых...

Дацэнта кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў Юрыя Станіслававіча Багданава, якога на час выпускных экзаменаў прызначылі старшынёй Дзяржаўнай камісіі Магілёўскага педагагічнага інстытута, надзвычай зацікавіў чарнявы юнак з выразнымі рухомымі рысамі твару. Бойкія адказы на ўсе пастаўленыя пытанні, стройная логіка ў разважаннях, непрыхаваная любоў да матэматыкі — усё гэта прымусіла дацэнта задаць пытанне, якое да экзаменацыйнага білета не мела прамога дачынення: дзе Ваня Мартынаў мае працаваць пасля заканчэння інстытута. Аказваецца, Ваню, як лепшага студэнта, пакідалі пры інстытуце на пасадзе асістэнта. І тут у Юрыя Станіслававіча ўзнікла думка: а ці не паспрабаваць Ваню паступіць у мэтавую аспірантуру універсітэта, каб пасля зноў вярнуцца ў родны інстытут? Кафедра матэматыкі з гэтай прапановай адразу ж згадзілася...

Тры лёсы. Ці зусім розныя яны? Не! І ў Леаніда, і ў Пятра, і ў Івана ёсць тое, што родніць іх. Гэта — любоў да сваёй справы, да любімага занятку — да роднай мовы, геаграфіі, матэматыкі. Падобныя і іх шляхі ў навуку: адпаведныя кафедры рэкамендавалі Акаловіча, Рогача, Мартынава ў аспірантуру непасрэдна пасля заканчэння вну. І, канешне, вучоныя саветы не памыліліся ў сваім выбары. З часам у навуку прыйдзе добрае папаўненне. Яно ўжо ідзе.

В. КАЧАНОВІЧ.

Да 40-годдзя ўзнікнення літаратурнай арганізацыі „Маладняк“

„Маладняк“ і „пісьменніцкі асяродак“

Не вельмі даўно ў зале пасяджэнняў Вучонага савета нашага універсітэта была абаронена кандыдацкая дысертацыя выкладчыкам кафедры беларускай літаратуры Нілам Сямёнавічам Гілевічам. Тэма яе — паэзія «Маладняка» — сведчыць не толькі пра актуальнасць і навізну ўзнятых пытанняў, але і працягвае даўнія традыцыі сувязей, што меліся паміж гэтай вядомай літаратурнай арганізацыяй і Беларускім дзяржаўным універсітэтам...

28 лістапада 1923 года. Шэсць чалавек — ужо даволі вядомыя ў той час паэты Міхась Чарот, Алесь Дудар, Язэп Пушча, Андрэй Александровіч, Анатоль Вольны, Адам Бабарэка — сабраліся ў адным з пакояў клуба «КІМ». Тады ж, як пра гэта крыху пазней успамінаў А. Александровіч, «дамовіліся стварыць літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», аб чым пад кволы агеньчык газніцы падпісалі ўстаноўчы пратакол. Старшынёй аб'яднання абралі М. Чарота, які быў ужо вядомым паэтам і творчасцю якога захаплялася моладзь. Акрэслілі характар дзейнасці «Маладняка». Ніхто... тады не думаў, што праз які год ці паўтара гэтае аб'яднанне будзе налічваць у сваіх шэрагах да пяцісот чалавек».

Аднак, з часам пачалі акрэслівацца сімптомы хваробы, якую перажывае амаль кожны малады арганізм, хваробы росту. Малады запал, надзвычайны энтузіязм сталі суседнічаць з разухабістасцю, непатрэбнай задзірыстасцю, некрытычным адмежаваннем ад усяго мінулага, з тым, што так ёмка ахрышчана «бурапенай». Гэта ў многім ішло ад недастатковага авалодання навуковай марксісцка-ленінскай тэорыяй, ад нізкага ўзроўню агульнай літаратуразнаўчай падрыхтоўкі.

І вось у лістападзе 1925 года І Усебеларускі з'езд «Маладняка» высунуў лозунг, на якім стаяла толькі адно слова: «Вучоба!». У прыватнасці, адной з задач было вывучэнне да наступнага з'езда кожным маладнякоўцам не менш адной замежнай мовы.

Менавіта ў гэты час пачынаецца сапраўдная сувязь «Маладняка» з Беларускім дзяржаўным універсітэтам. Ужо ў наступным, 1926 годзе ва універсітэт прыходзяць Кандрат Крапіва, Андрэй Александровіч, Алесь Якімовіч, крытык Мікалай Аляхновіч, з 3 курса педтэхнікума на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта БДУ пераводзіцца Пятро Глебка. Праз год ці два сюды паступаюць Пятрусь Броўка, Паўлюк Трус, Максім Лужанін, Васіль Каваль, Янка Скрыган і іншыя маладнякоўцы. Праўда, многія з іх пазней (у маі 1926, а затым на мяжы 1927—28 гадоў) выйшлі з арганізацыі, стварыўшы новыя літаратурныя аб'яднанні «Узвышша» і «Полымя». Аднак можна не сумнявацца, што кірунак на вучобу ім у многім падказаў «Маладняк».

Прыход ва універсітэт маладых літаратурных сіл прынёс вялікае ажыўленне ў студэнцкае жыццё. Цэнтральны орган арганізацыі часопіс «Маладняк» пісаў у лютым 1928 года:

«Беларускі дзяржаўны універсітэт з'яўляецца ў сучасны момант сапраўдным пісьменніцкім асяродкам на Беларусі. Значная частка беларускіх пісьменнікаў і паэтаў вучыцца зараз на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні. Штодня ў памяшканнях універсітэта можна сустрэць Крапіву, Александровіча, В. Каваля, С. Хурсіка, Фаміна, Дудара, Якімовіча, Барашку і інш.

У будынку універсітэта ў большасці наладжваюцца розныя літаратурныя вечары, дыспуты, даклады. За адсутнасцю будынка пісьменнікаў (ён быў адкрыты толькі ў канцы 1928 года. —В. Р.) універсітэт заслугоўвае поўнае права быць названым пісьменніцкім асяродкам».

Яшчэ раней, у 1925/26 навучальным годзе, у БДУ адбыліся вялікія вечары, прысвечаныя 460-годдзю беларускай кнігі, 20-годдзю літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Колас некаторы час чытаў ва універсітэце курс беларускай мовы і методыку яе выкладання, з'яўляўся старшынёй Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі літаратурна-лінгвістычнага аддзялення.

«Маладняк» з'яўляўся тым друкаваным органам, на старонках якога неаднаразова выступалі выдатныя вучоныя, што вялі педагагічную і навуковую працу ў сценах універсітэта. Часопіс не толькі змяшчаў іх артыкулы, даследаванні, але таксама інфармаваў чытача пра напрамак далейшых пошукаў вучоных.

У 1926 годзе святкавалася пяцігоддзе з дня заснавання БДУ. «Маладняк» адзначыў гэтую дату артыкулам рэктара універсітэта прафесара У. І. Пічэта «Юбілей Беларускага дзяржаўнага універсітэта» (1926 г., № 7). У артыкуле ярка асвятляліся першыя крокі па стварэнню універсітэта, камплектаванню яго навуковымі кадрамі, роля універсітэта ў падрыхтоўцы нацыянальных кадраў беларускай інтэлігенцыі. Артыкул чытаецца з цікавасцю і цяпер.

Восенню 1928 года «Маладняк», перайменаваны ўжо ў БелАПП, шырока адзначаў пяцігоддзе з дня свайго заснавання. Віншаванні надаслалі не толькі шматлікія літаратурныя арганізацыі савецкіх рэспублік, але і асабіста Аляксандр Серафімовіч, Якуб Колас і іншыя вядомыя пісьменнікі. На ўрачыстым вечары выступіў вядомы тагачасны лінгвіст прафесар нашага універсітэта П. Бузук. Ён сказаў: «Смешна, здавалася б, што мяне пасля таго, як пачаў падаць снег на маю галаву, пачынае прыцягваць да сябе моладзь, пачынае прыцягваць да сябе «Маладняк». Але гэтае імкненне да моладзі, ад якой можна пачэрпнуць бадзёрасці і сілы, я ніколі не хаваў і таму стараўся прыняць удзел у працы «Маладняка».

На гэтым жа вечары прафесар П. Бузук быў аднагалосна прыняты ў склад «Маладняка».

Такім чынам, на працягу ўсяго існавання, аж да ўваходу ў Саюз савецкіх пісьменнікаў, «Маладняк» падтрымліваў цесныя сувязі з «пісьменніцкім асяродкам», як назваў ён сам некалі Беларускі дзяржаўны універсітэт.

Не губляюцца гэтыя сувязі і цяпер. Былыя маладнякоўцы народныя паэты БССР Кандрат Крапіва і Пятрусь Броўка, акадэмік Пятро Глебка і іншыя неаднаразова выступалі перад студэнтамі і выкладчыкамі універсітэта, заўсёды з'яўляюцца нашымі жаданымі гасцямі.

Сувязь гэтая працягваецца і ў тым, што, як і некалі, Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна з'яўляецца тым «пісьменніцкім асяродкам», які бесперапынна папаўняе кадры беларускіх літаратараў.

Вячаслаў РАГОЙША,
аспірант.

ВЫПРАЎЛЕННЕ ПАМЫЛКІ

У папярэднім нумары ў спісу членаў камітэта камсамола прапушчана прозвішча студэнткі 5 курса матфака Валянціны Сяржант, адказнай за культурна-масавую работу.

Рэдактар М. ЮСЬКА.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсавпрофа.
АТ 01708. Тыр. 2000. Зак. 4409.